ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік старшыні
аргкамітэта заключнага этапу
рэспубліканскай алімпіяды,
намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь

А.У.Кадлубай
"1" снежня 2021 г.

**Парадак**
**правядзення заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“ і ”Беларуская літаратура“ ў 2022 годзе**

Парадак правядзення заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“ і ”Беларуская літаратура“ (далей – заключны этап алімпіяды) распрацаваны ў адпаведнасці з:

Інструкцыяй аб парадку правядзення рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 20.11.2003 № 73 (у рэдакцыі пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 08.10.2019 № 163);

загадам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 21.09.2021 № 654 ”Аб правядзенні ў 2021/2022 навучальным годзе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах“.

Ва ўмовах забеспячэння санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва і прадухілення распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі (COVID-19) пры правядзенні заключнага этапу алімпіяды неабходна кіравацца санітарна-эпідэміялагічнымі рэкамендацыямі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

**Месца і тэрмін правядзення заключнага этапу алімпіяды**

Заключны этап алімпіяды праводзіцца ў перыяд з 28 сакавіка па 1 красавіка 2022 г. на базе ўстаноў адукацыі г.Магілёва.

Заезд, размяшчэнне і рэгістрацыя ўдзельнікаў заключнага этапу алімпіяды (далей – удзельнікі) ажыццяўляюцца 28 сакавіка 2022 г. да 15.00.

Урачыстае адкрыццё заключнага этапу алімпіяды – 28 сакавіка 2022 г. у 17.00.

Урачыстае закрыццё заключнага этапу алімпіяды і ўзнагароджанне пераможцаў – 1 красавіка 2022 г. у 10.00.

Ад’езд удзельнікаў – 1 красавіка 2022 г. пасля 14.00.

**Састаў удзельнікаў заключнага этапу алімпіяды**

У заключным этапе алімпіяды прымаюць удзел па адной камандзе ад кожнай вобласці, г.Мінска і каманда дзяржаўнай установы адукацыі ”Ліцэй Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта“.

Састаў каманды Магілёўскай вобласці можа быць павялічаны не больш чым на 10 % з ліку вучняў устаноў адукацыі горада-арганізатара заключнага этапу алімпіяды – пераможцаў трэцяга этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“ і ”Беларуская літаратура“ (г.Магілёў).

**Колькасць тураў, форма і працягласць іх правядзення**

Заключны этап алімпіяды праводзіцца ў два туры:

I тур (напісанне водгуку) – 29 сакавіка 2022 г.;

II тур (выкананне комплекснай работы па вучэбных прадметах ”Беларуская мова“ і ”Беларуская літаратура“) – 30 сакавіка 2022 г.

I і II туры праводзяцца ў пісьмовай форме па асобных алімпіядных заданнях для кожнага з наступных класаў:

вучняў IX класаў;

вучняў X класаў (X-XI вячэрніх класаў), вучняў I курса ўстаноў прафесіянальна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якія паступілі ў гэтыя ўстановы на падставе агульнай базавай адукацыі;

вучняў XI класаў (XII вячэрніх класаў), вучняў II курса ўстаноў прафесіянальна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якія паступілі ў гэтыя ўстановы на падставе агульнай базавай адукацыі.

Працягласць I тура складае 4 астранамічныя гадзіны.

Працягласць II тура складае 3 астранамічныя гадзіны.

**Кіраўніцтва арганізацыяй і правядзеннем заключнага этапу алімпіяды**

Агульнае кіраўніцтва арганізацыяй і правядзеннем заключнага этапу алімпіяды ажыццяўляюць упаўнаважаныя прадстаўнікі арганізацыйнага камітэта заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды – галоўны спецыяліст упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Галоўнага ўпраўлення агульнай сярэдняй, дашкольнай і спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Булаўкіна І.У., малодшы навуковы супрацоўнік навукова-даследчага цэнтра Навукова-метадычнай установы ”Нацыянальны інстытут адукацыі“ Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Пятровіч М.М. (далей – упаўнаважаныя прадстаўнікі) сумесна з мясцовым аргкамітэтам, зацверджаным загадам галоўнага ўпраўлення па адукацыі Магілёўскага аблвыканкама да 1 лютага 2022 г.

**Мясцовы аргкамітэт заключнага этапу алімпіяды:**

уносіць прапановы ў праграму правядзення заключнага этапу алімпіяды;

вызначае ўстанову адукацыі, на базе якой праводзіцца заключны этап алімпіяды;

прадастаўляе памяшканні для працы членаў журы, упаўнаважаных прадстаўнікоў, кіраўнікоў каманд;

стварае ўмовы для захавання алімпіядных заданняў, работ удзельнікаў;

распрацоўвае схему рассадкі ўдзельнікаў у аўдыторыях;

набывае спецыяльны прыз Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь;

ажыццяўляе арганізацыю і правядзенне ўрачыстых мерапрыемстваў, якія звязаны з адкрыццём і закрыццём заключнага этапу алімпіяды.

прызначае:

адказных за суправаджэнне тураў заключнага этапу алімпіяды і спецыялістаў, адказных за рэгістрацыю і вядзенне базы даных удзельнікаў;

адказных за суправаджэнне тураў заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды, якія ажыццяўляюць скanіраванне алімпіядных заданняў, выкананых удзельнікамі, і перадачу іх упаўнаважаным прадстаўнікам аргкамітэта заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды пасля завяршэння кожнага тура;

забяспечвае:

арганізацыю размяшчэння, харчавання, транспартнага, медыцынскага і культурнага абслугоўвання ўдзельнікаў, а таксама арганізацыю размяшчэння кіраўнікоў каманд і членаў журы;

журы і ўдзельнікаў канцылярскімі прыналежнасцямі;

удзельнікаў праштампаванымі лістамі для выканання алімпіядных заданняў;

камп’ютарным абсталяваннем асоб, якія адказваюць за вядзенне базы даных удзельнікаў;

аснашчэнне кабінетаў абсталяваннем для скanіравання алімпіядных заданняў, выкананых удзельнікамі заключнага этапу алімпіяды;

правядзенне гутаркі з удзельнікамі па правілах пажарнай бяспекі, дарожнага руху і бяспечных паводзін;

дзяжурства ў месцы правядзення тураў заключнага этапу алімпіяды.

У склад мясцовага аргкамітэта ўключаюцца асобы, адказныя за суправаджэнне тураў заключнага этапу алімпіяды, з ліку педагагічных работнікаў (за выключэннем настаўнікаў (выкладчыкаў) вучэбных прадметаў ”Беларуская мова“ і ”Беларуская літаратура“) установы адукацыі, на базе якой праводзіцца заключны этап алімпіяды, а таксама асобы, адказныя за вядзенне базы даных удзельнікаў.

**Правядзенне заключнага этапу алімпіяды**

Асобы, адказныя за суправаджэнне тураў заключнага этапу алімпіяды забяспечваюць рассадку ўдзельнікаў па дакументах, якія пацвярджаюць асобу ўдзельніка.

Перасадзіць удзельніка дазваляецца асобе, адказнай за суправаджэнне тура алімпіяды, па ўзгадненні з упаўнаважанымі прадстаўнікамі.

Перад пачаткам тура заключнага этапу алімпіяды кожны яе ўдзельнік атрымлівае неабходныя канцылярскія прыналежнасці, бланк асабістай карткі ўдзельніка (далей – асабістая картка) і праштампаваныя лісты А4 для выканання алімпіяднага задання (напісанне водгуку).

Адкрыццё канвертаў і забеспячэнне кожнага ўдзельніка алімпіяднымі заданнямі ажыццяўляюць упаўнаважаныя прадстаўнікі перад пачаткам адпаведнага тура заключнага этапу алімпіяды ў месцы яго правядзення. Алімпіядныя заданні раскладваюцца друкаваным бокам уніз на рабочае месца кожнага ўдзельніка.

Перад выкананнем задання ўдзельнік запаўняе адпаведныя графы асабістай карткі ўдзельніка.

Час для выканання алімпіядных заданняў адлічваецца ад моманту атрымання тэкстаў заданняў удзельнікамі (не ўлічваецца час, затрачаны ўдзельнікам на запаўненне асабістай карткі).

На тытульным і іншых лістах, на якіх выконваюцца алімпіядныя заданні, удзельнікам забараняецца рабіць любыя паметкі.

Падчас правядзення тураў алімпіяды (напісанне водгуку, выкананне комплекснай работы) у кабінетах (аўдыторыях) знаходзяцца асобы, адказныя за суправаджэнне тураў заключнага этапу алімпіяды.

Падчас правядзення тураў алімпіяды вучні могуць задаваць у пісьмовай форме пытанні, якія не тычацца спосабаў, метадаў і сутнасці выканання заданняў (не больш за тры пытанні ад аднаго вучня). Адказны за суправаджэнне тура алімпіяды атрымлівае пытанне ад вучня на лісце А4 са штампам, у якім прадугледжана месца для адказу. Пытанне вучня перадаецца старшыні (або членам) журы, якія знаходзяцца ў спецыяльна адведзеным пакоі. Члены журы пісьмова (сцісла) адказваюць на пастаўленае пытанне і аддаюць адказ адказнаму за суправаджэнне тура алімпіяды. Адказны за суправаджэнне тура алімпіяды зачытвае ўслых пытанне і адказ на яго ва ўсіх аўдыторыях адпаведнага класа (ліст адказу вучню не перадаецца).

Пасля завяршэння адпаведнага тура заключнага этапу алімпіяды яго ўдзельнікі здаюць асабістыя карткі, лісты, у якіх яны выконвалі алімпіядныя заданні, адказнаму за суправаджэнне тура заключнага этапу алімпіяды. Адказны за суправаджэнне тура заключнага этапу алімпіяды перадае іх упаўнаважаным прадстаўнікам для шыфравання.

Пасля шыфравання адказныя за суправаджэнне тура заключнага этапу алімпіяды ажыццяўляюць сканіраванне выкананых удзельнікамі алімпіядных заданняў і перадачу іх упаўнаважаным прадстаўнікам.

Усе лісты з пытаннямі вучняў і адказамі членаў журы таксама перадаюцца ўпаўнаважаным прадстаўнікам.

Упаўнаважаныя прадстаўнікі забяспечваюць перадачу выкананых удзельнікамі алімпіядных работ (сканіраваных і ў папяровым варыянце) ва ўстанову адукацыі «Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў» (далей – РІКВ) да 1 красавіка 2022 г.

У кожнай установе адукацыі, вызначанай для правядзення тура заключнага этапу алімпіяды, падчас правядзення тура арганізуецца дзяжурства медыцынскага работніка.

**Парадак шыфравання і дэшыфравання работ удзельнікаў заключнага этапу алімпіяды**

Шыфраванне работ удзельнікаў I і II тураў заключнага этапу алімпіяды ажыццяўляецца ўпаўнаважанымі прадстаўнікамі. У час шыфравання кожнаму ўдзельніку прысвойваецца ідэнтыфікацыйны нумар (розны для кожнага тура), які заносіцца на тытульны ліст работы ўдзельніка.

За забеспячэнне канфідэнцыяльнасці ідэнтыфікацыйных нумароў удзельнікаў нясуць адказнасць упаўнаважаныя прадстаўнікі.

Дэшыфраванне работ удзельнікаў праводзіцца ўпаўнаважанымі прадстаўнікамі пасля завяршэння ўсіх тураў заключнага этапу алімпіяды і работы журы па іх ацэньванні.

**Парадак збору і прадстаўлення журы выкананых удзельнікамі заданняў**

Пасля шыфравання работ (водгук, комплексная работа) упаўнаважаныя прадстаўнікі перадаюць работы ўдзельнікаў членам журы, якія адказваюць за арганізацыю праверкі выканання алімпіядных заданняў у адпаведным класе (курсе).

Пасля праверкі і ацэньвання работ члены журы перадаюць іх упаўнаважаным прадстаўнікам, якія нясуць адказнасць за забеспячэнне канфідэнцыяльнасці выкананых алімпіядных заданняў і вынікаў іх ацэньвання.

**Колькасны састаў і парадак работы журы**

Колькасны састаў журы складае 18 чалавек. Старшыня журы размяркоўвае членаў журы для праверкі і ацэньвання алімпіядных заданняў у кожным класе, прызначае адказных за праверку і ацэньванне работ вучняў адпаведнага класа.

Адказны за арганізацыю праверкі і ацэньвання работ вучняў адпаведнага класа размяркоўвае членаў журы для праверкі і ацэньвання пэўнага алімпіяднага задання.

Члены журы нясуць адказнасць за якасць, аб’ектыўнасць, вынікі праверкі і ацэньвання выкананых алімпіядных заданняў.

Члены журы правяраюць і ацэньваюць алімпіядныя заданні ў дзень правядзення тура заключнага этапу алімпіяды і працуюць у спецыяльна адведзеным мясцовым аргкамітэтам класе (аўдыторыі).

Вынікі ацэньвання алімпіядных заданняў выносяцца на тытульны ліст работы ўдзельніка. Кожны член журы вынікі ацэньвання алімпіядных заданняў пацвярджае сваім подпісам.

Членам журы забаронена:

заходзіць у аўдыторыі, дзе праходзяць туры алімпіяды,

уносіць змены, паметкі, удакладненні ў працу ўдзельнікаў, за выключэннем пазначэння выпраўлення памылак, дапушчаных вучнямі, вынікаў ацэньвання і свайго подпісу.

Пасля завяршэння адпаведнага тура заключнага этапу алімпіяды адказны за арганізацыю праверкі работ у кожным класе перадае работы ўдзельнікаў упаўнаважаным прадстаўнікам.

На пасяджэннях журы могуць прысутнічаць упаўнаважаныя прадстаўнікі.

**Парадак азнаямлення ўдзельнікаў з вынікамі ацэньвання алімпіядных заданняў і разгляду журы зваротаў удзельнікаў па пытаннях ацэньвання выкананых імі алімпіядных заданняў**

Пасля завяршэння тураў заключнага этапу алімпіяды і праверкі алімпіядных заданняў усіх вучняў журы праводзіць у кожным класе аналіз выканання алімпіядных заданняў і знаёміць удзельнікаў з вынікамі ацэньвання работ.

Удзельнікі маюць права прагледзець свае работы, задаць удакладняючыя пытанні.

Зварот удзельніка па пытанні ацэньвання выкананага ім алімпіяднага задання разглядаецца тым членам журы, які правяраў дадзенае заданне.

Спрэчныя пытанні разглядаюцца сумесна са старшынёй журы і ўпаўнаважанымі прадстаўнікамі. Пры неабходнасці праводзіцца пасяджэнне журы, на якім прымаецца канчатковае рашэнне па ацэньванні адпаведнага алімпіяднага задання і ўвогуле ўсёй выкананай работы.

**У час правядзення тура заключнага этапу алімпіяды ўдзельнік мае права:**

пісьмова задаваць пытанні членам журы па ўмовах алімпіядных заданняў;

пакідаць месца выканання алімпіяднага задання ў выключных выпадках з дазволу і ў суправаджэнні асобы, адказнай за суправаджэнне адпаведнага тура.

**У час правядзення тура заключнага этапу алімпіяды ўдзельніку забараняецца:**

выкарыстоўваць кнігі, іншыя пісьмовыя або друкаваныя матэрыялы, за выключэннем матэрыялаў, якія прадастаўлены аргкамітэтам алімпіяды;

мець пры сабе прылады захоўвання, прыёму і перадачы інфармацыі (мабільны тэлефон, электронная запісваючая кніжка, флэш-дыск, CD-R/W дыскі і інш.);

абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі, за выключэннем адказнага за правядзенне тура алімпіяды, упаўнаважаных прадстаўнікоў.

**Парадак перагляду, анулявання вынікаў выканання алімпіядных заданняў**

Вынікі выканання алімпіядных заданняў удзельнікаў пераглядаюцца і анулююцца ў выпадках:

невыканання ўдзельнікам алімпіяды любога з названых патрабаванняў гэтага Парадку;

выяўлення пры праверцы і ацэньванні работ плагіяту, спісвання і іншых фактаў, якія паказваюць на несамастойнае выкананне алімпіяднага задання.

Упаўнаважаныя прадстаўнікі сумесна з членамі мясцовага аргкамітэта, старшынёй журы складаюць акт аб выдаленні ўдзельніка з аўдыторыі і (або)ануляванні вынікаў выканання алімпіядных заданняў (прыкладаецца).

У спрэчных момантах рашэнне абануляванні вынікаў выканання алімпіядных заданняў удзельнікаў, якія парушылі гэты Парадак, прымаецца старшынёй аргкамітэта заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды пасля правядзення заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды.

**Парадак вядзення базы даных удзельнікаў заключнага этапу алімпіяды**

Запаўненне базы даных удзельнікаў да пачатку дэшыфравання работ і разгляду зваротаў удзельнікаў па пытаннях ацэньвання выкананых імі алімпіядных заданняў ажыццяўляецца па ідэнтыфікацыйных нумарах.

**Парадак захоўвання алімпіядных заданняў і работ удзельнікаў заключнага этапу алімпіяды**

У час правядзення заключнага этапу алімпіяды выкананыя ўдзельнікамі работы захоўваюцца ў апячатаным сейфе ўстановы адукацыі, на базе якой праводзіцца заключны этап алімпіяды.

Пасля завяршэння заключнага этапу алімпіяды работы ўдзельнікаў (скануваныя і ў папяровым варыянце) захоўваюцца ў РІКВ да 1 верасня 2022 г.

Дадатак

АКТ
аб выдаленні ўдзельніка з аўдыторыі
і (або) ануляванні вынікаў выканання
алімпіядных заданняў

№ дата складання акта

Складзены камісіяй:
*Старшыня – упаўнаважаны прадстаўнік заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды*
Члены камісіі:
*старшыня журы*
*член журы*
*прадстаўнікі мясцовага аргкамітэта*

Тэкст аб парушэнні і заўвагах

*Подпісы:*

Старшыня камісіі ______________________________

Члены камісіі:

______________________________
______________________________
______________________________